ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ '90

ЧАЦВЕР 7 ЧЭРВЕНЯ № 19 (1648)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

НЕ ПРАМІНІЦЕ

## КВЕТКІ ЗЯМЛІ

Хто з вас трымаў у руках лунны камень, не абясцэнены кратамі аправы, а самы сапраўдны? Хто з дзіцячай няўрымслівасцю лавіў ім, бы люстэркам, прамень сонца і назіраў блакітнае зіхаценне?

Тыя, хто наведаў Дом прыроды, што ў Траецкім прадмесці, дзе адкрыта выстава «Каменныя кветкі зямлі». А прадстаўлены на выставе ўзоры мінералаў і горных парод (ювелірныя і вырабныя камяні) геалагічнага музея Інстытута геалогіі і геаграфіі АН БССР, музея землязнаўства геафака БДУ імя У. І. Леніна і аматараў-калекцыянераў.

Арганізатары выставы (навукова-вытворчая фірма «Нэссі», вышэйназваныя музеі) пастараліся зрабіць так, каб для наведвальнікаў яна была і прыемнай, і карыснай.

Калі вы калекцыянер мінералаў і жадаеце папоўніць сваю калекцыю, калі марыце набыць свой (па гараскопу) камень,— да вашых паслуг арганізаваны іх продаж.

Калі вы задаліся мэтай, ці каштоўны камень у вашых завушніцах, пацерках, брошках,— звярніцеся да кансультантаў выставы Крэсціны Мікалаеўны РАМАНЕНКА і Валянціны Лявонцьеўны СМАЛЯКОВАЙ — супрацоўнікаў музея землязнаўства БДУ. Для праверкі яны маюць розныя фізічныя і хімічныя сродкі.

Калі вы хочаце пачуць цікавы, даступны расказ аб будове, прыродзе мінералаў, даведацца аб існаванні мноства загадкавых легенд і паданняў,— калі ласка, звяртайцеся да экскурсаводаў.

Камяні — застыўшыя кветкі зямлі. Яны распускаюцца адзін раз у стагоддзе. Так што спяшайцеся іх убачыць: другое тысячагоддзе надыдзе не хутка.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.

ГРОШЫ НА СТОЛ!

## Пяцьдзесят на пяцьдзесят

*Праціўнікі ўсялякіх апаратаў і апаратчыкаў, можаце радавацца: колькасць вызваленых камсамольскіх работнікаў ва універсітэце будзе скарачацца.*

Як адзначыў намеснік сакратара камітэта камсамола Андрэй РУСАКОВІЧ, дзейнасць ведамства па справах моладзі драбнее, разам з тым змяншаюцца і грашовыя ахвяраванні яго радавых членаў — узносы.

Калі ў мінулым годзе толькі 15 працэнтаў камсамольскіх узносаў заставаліся на рахунку універсітэцкага і факультэцкага камсамола, а астатнія ішлі «наверх», то цяпер здадзеныя грошы размяркоўваюцца выключна ў межах універсітэта. 50 працэнтаў ідзе «на месца» (факультэты) а 50 — застаюцца універсітэцкаму камітэту камсамола. Пяцьдзесят на пяцьдзесят.

Нягледзячы на гэту відавочную дэмакратызацыю ў справе з камсамольскай казной, яна працягвае няўхільна бяднець, а пратаптаныя дзесяцігоддзямі сцежкі-дарожкі здачы камсамольскіх узносаў — зарастаюць быллём. А. Русаковіч ужо і не помніць, калі апошні раз журфак здаваў грошы. Была некалькі месяцаў назад 25-рублёвая квітанцыя аб уплаце членскіх узносаў усяго журфака — і ўсё. Таму можа і ходзяць па факультэту чуткі, што ўсіх выключылі з камсамола.

Не ў лепшым стане справа з узносамі на геафаку, хімфаку. Пытанне ставяць рубам: аддавайце нашы грошы.

А што аддаваць? Цяпер на балансе камітэта камсамола не больш за тры тысячы рублёў і не менш дзесятка буйных мерапрыемстваў.

Асноўная частка паступленняў — узносы з будатрадаўскіх заробкаў студэнтаў. А яны з году ў год скарачаюцца, як знікае і жаданне аддаваць іх на «апарат».

На «апарат», які амаль што ў гордай адзіноце праводзіць усе асноўныя універсітэцкія культурна-масавыя мерапрыемствы, ідзе не больш 30 працэнтаў долі. А ўсё астатняе для нас: дыскатэкі, сустрэчы, вечары, значкі і майкі з эмблемай універсітэта. Да таго ж фінансавую дзейнасць камітэта камсамола кантралюе шэраг раённых і абласных камісій. Пакуль парушэнняў і злоўжыванняў «апаратчыкамі» ад камсамолу не выяўлена.

ЁСЦЬ ЗАГАД

## На Салаўкі!..

Праўда-праўда, такія загады яшчэ існуюць. Не дзе-небудзь, а ў нашай альма-матэр, на геаграфічным факультэце. І тыя, хто пачуў гэты загад, не ўцягваюць трывожна галаву ў плечы, а хутчэй наадварот. Няўжо так хочацца на Салаўкі?

Загад аб комплекснай міжзанальнай геаграфічнай практыцы ў канцы другога курса геафака.

Салаўкі, а больш дакладна, Еўрапейская Поўнач (г. зн. і Мурманск, і Апатыты, і Архангельск) — традыцыйнае месца першых геаграфічных даследаванняў студэнтаў. Праўда, ёсць яшчэ Сярэдняя Азія, Грузія, Малдавія. Ці былі... На гэты раз яны пакінуты без увагі па прычынах павышанай «экстрэмістасці». Мэта такой практыкі — гэта ў першую чаргу спакойнае даследаванне эканамічных, сацыяльных, геаграфічных і нават псіхалагічных асаблівасцей рэгіёна.

Таму чатыры акадэмічныя групы, а гэта каля сотні будучых географаў, дружна «рушаць» на Салаўкі і прабудуць там ні многа, ні мала — тры тыдні.

Падарожжа абыдзецца універсітэту ў капеечку і, трэба сказаць, не малую: каля шасці з паловай тысяч рублёў на ўсё пра ўсё. Амаль столькі, але ўжо кіламетраў, давядзецца «адмераць» студэнтам-практыкантам і іх кіраўнікам. Але, па словах саміх географаў, гульня каштуе адмераных тысяч кіламетраў і затрачаных грошай. Вывучэнне прыродных асаблівасцей увачавідкі не заменяць шматлікія падручнікі па геаграфіі БССР.

Такую ж форму праходжання практыкі ў недалёкім будучым на геафаку хочуць увесці і на завочным аддзяленні. Ну як можна расказваць школьнікам пра пустыні, ніводнага разу не адчуўшы іх спякоту і... прыгажосць. Сапраўды, як?!

Таму са спісу тых, хто падлягае часовай «высылцы» на Салаўкі, выкрэсліваюцца толькі прозвішчы не здольных да гэтага падарожжа па стану здароўя.

САКРЭТ ФІРМЫ



*Што неабходна сучаснаму бухгалтару, таваразнаўцу, рэвізору? Акрамя ведаў, зразумела, патрэбна яшчэ валодаць камп'ютэрам і рознымі вылічальнымі сістэмамі. Гэтаму вучаць і вучацца студэнты БДІНГ у сваім інфармацыйна-вылічальным цэнтры і розных дысплейных класах, якіх у інстытуце больш за дваццаць.*

*Г. БАБКІН.*

ХТО ДА НАС ПРЫЙШОЎ!

## Радзім Гарэцкі

**АКАДЭМІК АН БССР, ДЫРЭКТАР ІНСТЫТУТА ГЕАХІМІІ І ГЕАФІЗІКІ, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ БССР, ЛАЎРЭАТ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ СССР І БССР. СУСТРЭЧУ АРГАНІЗАВАЛА ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ БДУ.**

Яшчэ нядаўна лічылася, што зямля беларуская бедная, край лясоў і балот... Ні ў адным старым падручніку не знойдзеце вы звестак пра багацці зямлі нашай. Не толькі яе недраў, але і скарбаў культуры, навукі. Магчыма, у гэтым адна з прычын, што беларускі народ ледзь не страціў гісторыю, культуру і мову.

Аб гэтых і іншых праблемах ішла размова ў час сутрэчы студэнтаў-географаў з Радзімам Гаўрылавічам Гарэцкім. Бацька Радзіма Гарэцкага — аўтар аднаго з першых беларуска-рускіх слоўнікаў. У студэнцкіх чытаннях, прысвечаных 90-годдзю складальніка слоўніка, прынялі ўдзел не толькі студэнты нашага універсітэта, але і Мінскага педагагічнага інстытута.

А колькі яшчэ пазабывана волатаў беларускай навукі і культуры? Колькі яшчэ імёнаў, якія праславілі Беларусь, невядомыя нам?

П. ЛОПУХ,
намеснік дэкана
геаграфічнага факультэта.

ЧАС — ПІК

## Хочацца плакаць...

Калі студэнт атрымлівае на экзамене «двойку», яе вытокі выкладчыкі і бацькі бачаць толькі ў асабістай яго ляноце, і чамусьці нікому ў галаву не прыходзіць, а як можна вывучыць прадмет на «пяцёрку» ў інтэрнацкіх чыталках тыпу «склеп». Гэтыя пакоі на кожным паверсе інтэрната могуць служыць і залай для начной дыскатэкі, і зацішным месцам шматлікіх спатканняў, але толькі не ўтульным памяшканнем здабычы неабходных ведаў.

Хочацца плакаць, гледзячы на старыя развалюхі-парты, на дзверы без шыбаў. Зімой працаваць тут немагчыма, а летам — неверагодна нудліва. Трэба сказаць, што вінаватыя мы самі: і ў разбітых шыбах, і ў стане сталоў і сцен. Але хто і калі на гэта зверне ўвагу: камітэт камсамола, студэнцкі савет, прафсаюз, адміністрацыя інтэрната? Яны ж усе ў адказе за інтэрнаты.

А. ГАЎРЫЛЬЧЫК.

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта» Аляксандр КОКТЫШ.

## ЗГУЛЯЕМ?





У мінулыя выхадныя тысячы мінчан змаглі пазнаёміцца з экзатычнай пакуль што для нашай рэспублікі гульнёй — амерыканскім футболам. Усё для нас у ёй незвычайнае — магутныя ігракі іншапланетнага выгляду, іх баявыя даспехі, правілы гульні. І хоць нашых «Мінскіх драконаў» госці «Маскоўскія чарадзеі» ўсё ж перамаглі, гэта амаль нікога не засмуціла. Галоўным было незвычайнае, радаснае знаёмства з цікавым, нетрадыцыйным відам спорту.

*Фота С. ГРЫЦА.*

СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ

# МЕРИДИАН

ПРИЕМНАЯ

## ПРОГНОЗ НА XXI ВЕК

**Александр Викторович ШАРАПО, проректор по международным связям:**

— Основные формы развития международных контактов университета нынче — совместные научные исследования в рамках межвузовского сотрудничества с учебными заведениями социалистических и развивающихся стран в подготовке национальных кадров высшей квалификации для различных отраслей народного хозяйства, совместная работа в области актуальных исследований по гуманитарным и естественным наукам, стажировка специалистов по приоритетным направлениям развития науки и техники, взаимное повышение квалификации специалистов в университетах и научных центрах социалистических и капиталистических стран.

Ученые БГУ со своими зарубежными коллегами проводят совместные исследования по 25 актуальным темам.

И все же, основной задачей сотрудничества остается для нас подготовка национальных кадров высокой квалификации для социалистических, развивающихся и некоторых капиталистических государств.

Престиж советского диплома в мире во многом зависит от того, получат ли зарубежные специалисты, прошедшие подготовку в нашей стране, глубокие теоретические и профессиональные знания.

В решении задачи совершенствования преподавания дисциплин не обойтись без фундаментальной перестройки процесса обучения и воспитания, технического перевооружения учебного процесса, значительного улучшения условий труда иностранных учащихся в лекционных залах, учебных кабинетах и лабораториях. При этом особенно важной видится нам коррекция учебных планов и программ с тем, чтобы максимально учесть в них новейшие достижения науки и техники.

Пересмотр учебных планов и программ был бы неполным и некачественным без учета межпредметной и внутрипредметной диалектики профессиональных дисциплин. Прежде всего последовательность и взаимосвязь учебных предметов. Этот принцип предусматривает увязку по времени прохождения учащимися как дисциплин, традиционно свойственных той или иной специальности, так и спецкурсов, спецсеминаров, да и других предметов, необходимых для профессионального и общего интеллектуального роста специалиста. Учитывая специфику в типовых и индивидуальных учебных планах для иностранных студентов, четко определены базы практики, значительно увеличено количество учебных часов на спецкурсы и спецсеминары.

Но как разрабатывать прогрессивные оптимальные методы опережающего обучения, если сохраняется громоздкий объем учебных часов на обязательные дисциплины и практические, семинарские, лабораторные занятия, которые рассчитаны на посредственных по уровню знаний, случается, слабых иностранных студентов?

Сократить общий объем таких дисциплин и за счет этого ввести новые — проблема более чем сложная. Ведь общая интеллектуальная подготовленность юношей и девушек, прибывших к нам на учебу, неодинакова. В большинстве своем, откровенно говоря, это молодежь с низкими, не соответствующими требованиям советской высшей школы знаниями. К тому же, система и структура общеобразовательной подготовки во многих зарубежных странах коренным образом отличается от нашей. Все это отягощает проведение перестройки учебного процесса, особенно на начальном этапе обучения.

Выход мы нашли. По рекомендации ректората и парткома, с 1988 года проводятся с иностранными гражданами, которые пожелали стать студентами университета, собеседования.

Многим из граждан зарубежных стран, направленных по старинке на учебу в наш университет, из-за выявленной недостаточности общих знаний пришлось идти в другие высшие, средне-специальные или даже профессионально-технические учебные заведения.



В учебных планах ставка делается сегодня не на какие-то частные, косметические изменения в модели обучения. Разумеется, изменение педагогической документации вузовской практики происходит «конвейерно», без остановок, а перестройка лекционного материала требует прежде всего фундаментальной переработки циклов. И ведь как раз последняя основывается на прогнозах на XXI век, дает ясную целевую ориентацию.

Но, опять же к сожалению, при всем стремлении преподавателей методология не может быть быстро внедрена на всех факультетах и кафедрах без использования современных технических средств и новейших информационных технологий. Часто на лекционных, практических, семинарских и даже лабораторных занятиях преподаватель «вооружен»... мелом и доской.

Весьма серьезно встает и другая проблема — оперативного обновления учебников, учебных пособий, проведения перспективных исследований по общественным и естественным наукам, детального изучения мировых передовых технологий, передовой психолого-педагогической теории и практики.

Лучше один раз увидеть, чем сто раз прочитать про ту или иную страну. Особенно преподавателю, который во время учебного и воспитательного процессов постоянно рядом с иностранными студентами. Увеличение стажировки в университеты и научные центры социалистических и капиталистических государств педагогов университета даст возможность объединить иностранных студентов в отдельные самостоятельные группы по странам или регионам для проведения не только практических и лабораторных занятий, но и чтения лекций с ориентацией на реализацию необходимого профиля работы у себя на родине.

Вот с такими трудностями и проблемами сталкиваемся мы, такие вводим изменения, стремясь к повышению качественного уровня преподавания.

ПОДУМАЕМ ВМЕСТЕ

## Сколько нянек нужно студенту?

Каждый учащийся непременно ответит: считаю себя самостоятельным, могу решать все проблемы сам, без посторонней помощи. Да и какие проблемы? Деканат на месте. Если не попадать в разряд задолженников, встречи с ним можно свести до минимума.

Что же касается досуга, то здесь, как говорится, вольному воля. Благо, сейчас можно выбрать форму отдыха на любой вкус. Всё зависит от желания и инициативы. Если же я не участвую в факультетских мероприятиях, то это потому, что занят другими делами, для меня полезными.

Вот и получается, живём рядом, учимся вместе, а знаем друг друга плохо. Каждый обитает в своём «мирке», занят своими проблемами.

Не хочу винить молодёжь в отсутствии душевных качеств. Они есть. Доброта к ближнему, соучастие, взаимопомощь... Однако, случается, проявлять их мы не спешим, будто стесняемся кого-то. Поэтому общение становится избирательным и очень суженным.

Кто виноват в том, что так происходит? Часто можно услышать упрёки в адрес системы образования, администрации. Виноваты, будто, плохая забота о внеучебном времени студента, излишняя заорганизованность. А в итоге — полупустые залы на проводимых мероприятиях, будь то встреча с известным писателем или традиционное празднование знаменательных дат.

Для чего необходим в вузе институт кураторов, видимо, объяснять не надо. Кроме того, что это связующее звено между администрацией и отдельным учащимся, по «обязанности» выполняющее роль первого заинтересованного лица в судьбе студента, каждый куратор, по-моему, душой болеет за своих подопечных. А то, что куратор необходим иностранному студенту, понимают все. К нему можно подойти с вопросом, получить разъяснение по любой проблеме, поделиться личными переживаниями. Куратор — авторитет, который олицетворяет в данном случае государственного человека, несущего ответственность за пребывание и обучение иностранных граждан в нашей стране.

Коротко остановлюсь на том, какую работу проводят кураторы на факультете журналистики.

С нынешнего учебного года в деятельности кураторов произошли существенные изменения. Были отменены еженедельные кураторские часы, реорганизованы группы (теперь они объединяют студентов по землячествам). Приоритетной стала индивидуальная работа (безусловно, не в ущерб массовой).

Составляются планы, назначаются ответственные, пишутся сценарии и объявления — стараются кураторы. Студентам предлагается посетить и поучаствовать. Время и место назначается самое удобное. Но, увы, посещаемость проводимых мероприятий оставляет желать лучшего.

Кураторами, студентами-активистами, которых, к сожалению, очень мало, затрачивается немало сил и времени, а отдачу и удовлетворение получаешь не всегда. Вот и подумалось: если бы кураторов было (как в той пословице) в семь раз больше, вряд ли что-то изменилось. Долго, наверное, придётся ждать, когда студенты будут сами приглашать преподавателей на организованные ими праздники. Ведь, говорят, когда-то было и такое. А пока...

Пока кураторы не превратились в настоящих нянек, надо отходить от существующих стереотипов и в массовой работе. Искать новые формы, если старые не годятся. К примеру, было бы неплохо попробовать организовать постоянно действующие клубы (хотя бы раз в месяц). Без проведения торжественной части, «штатного» концерта и короткой дискотеки, но с подготовленным кратким вступлением, импровизированной беседой и весёлой танцевальной программой, возможно, также тематической. Идей и предложений может быть много. Главное, зажечь инициативу в студенческой среде, чтобы клуб оказался действительно действующим.

Считаю, что существование одного подобного клуба в университетском масштабе с привлечением иностранных студентов всех факультетов может заменить целый ряд плановых разрозненных мероприятий. Подготовку же его «заседаний» можно вести поочерёдно.

Однако опять предложение «сверху». Что же скажут сами студенты? Чего хотят они?

**ЖДЕМ ВАШИХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ. А ЕСЛИ ТАКОВЫХ НЕ ПОСТУПИТ, БУДЕМ СЧИТАТЬ, ЧТО ВЫ СОГЛАСНЫ НЕЗАМЕТНО СУЩЕСТВОВАТЬ В СВОЕМ МАЛЕНЬКОМ МИРКЕ, ЗАНИМАТЬСЯ ТОЛЬКО СОБСТВЕННЫМИ ПРОБЛЕМАМИ И НЕ ЖЕЛАЕТЕ ПОДУМАТЬ О СВОЕМ БЛИЖНЕМ: СОСЕДЕ, СОКУРСНИКЕ, ДРУГЕ, КОТОРЫЕ ТАКЖЕ СКУЧАЮТ. КУРАТОР, КИКИМ БЫ ТРУДОЛЮБИВЫМ И ДОБРОСОВЕСТНЫМ ОН НИ БЫЛ, В ДАННОМ СЛУЧАЕ ВАМ НЕ ПОМОЖЕТ.**

Е. КОНОНОВА,
куратор факультета журналистики.

ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬСЯ!

## Гостям всегда рады

*...Вы находитесь в самом достопримечательном месте студенческого городка — общежитии. Не будем указывать его номер — все они в общем похожи друг на друга.*

*Утро. В это время суток здесь самый настоящий переполох. Все суетятся, спешат, стараются быстрее позавтракать и бежать на занятия. Медики рекомендуют нам утром горячий чай и бутерброд. Если вторую половину рекомендаций хоть с трудом, но выполнить можно, то вскипятить чай удаётся не каждому: наплыв на кухню огромный, а газовых плит — раз, два — и обчёлся, да и на них половина горелок в нерабочем состоянии.*

*Кстати, чуть не забыл предупредить: направляясь на кухню, внимательно смотрите под ноги, не то ваше посещение может оказаться не совсем безопасным и вы рискуете упасть, за что-либо зацепившись (причём, в комнатах ситуация аналогичная). К сожалению, каждый культуру «общего жития» понимает по-своему. Это в первую очередь касается некоторых африканских студентов, не исключение и советские. Многие из них забывают, что на протяжении пяти лет они являются хозяевами в этом доме.*

*Наше путешествие продолжается. Заглянем в комнаты. У русских есть хорошая поговорка: «В тесноте, да не в обиде». Создаётся впечатление, что при заселении руководствовались именно этим принципом. Иначе почему в трёхместной комнате живут по четыре, а то и по пять человек. Я понимаю, новый университет ещё построят не скоро, а в старом не хватает мест, но тем не менее надо подумать и о студентах, особенно об иностранных. Как в таких условиях можно успешно учиться? Не потому ли среди иностранных учащихся высок процент неуспевающих? Да и конфликтов между ними и советскими студентами вряд ли от этого станет меньше. Наверное, есть смысл подумать о создании лучших условий для учёбы и отдыха иностранных учащихся.*

*...Мы заканчиваем нашу небольшую экскурсию, познакомившись лишь с некоторыми проблемами, с которыми повседневно сталкиваются иностранные студенты. Если кто-то захочет воочию убедиться в этом, приглашаем вас в гости. Гостям мы всегда рады. Только внимательно смотрите под ноги.*

Х. Э. САНЧЕС,
студент философско-экономического факультета (Никорагуа).

## НАШИ ОБЩИЕ ПРОБЛЕМЫ

# Чтоб годы были золотыми

Каждый человек, приезжая в чужую страну, оказывается в новой, непривычной обстановке. Иностранные студенты, попадающие в нашу страну на учёбу, в этом смысле не исключение. Радость от осуществления давнего желания — учиться в Советском Союзе — порой сменяется ощущением дискомфорта от столкновения надежд с действительностью. В такой ситуации просто необходимо общение с друзьями, которое может обеспечить психологическую защиту от трудностей. Найти добрых знакомых в чужой стране не всегда получается сразу у всех иностранцев. Главной опорой для них становятся земляки, участие в деятельности землячеств. Контактируя с посольством своей страны, с администрацией университета, члены землячеств помогают друг другу решать все проблемы, которые приносит жизнь, — учебы, быта, здоровья.

В БГУ существуют разные землячества. И такие крупные, как Вьетнама и Сирии, и совсем маленькие — по 3—5 человек, например, Анголы, Мозамбика, Чада. Их проблемы схожи. И не так уж отличаются от тех, которые встают перед советскими студентами. Они живут в том же городе, дышут его загазованным воздухом, приходят, как домой, в те же переполненные общежития, так же страдают от нехватки аудиторий и оборудования в университете, да и чернобыльская радиация существует для них в той же дозе, тем более, что в Гомеле иностранные студенты учатся тоже. И очереди у нас одни на всех, и дефицит продуктов и товаров первой необходимости.

Студенты-иностранцы не отделяют себя от нашей жизни, с ее радостями и трудностями. Белоруссия становится для них второй родиной: ведь здесь проходят лучшие годы молодости — студенческие.

Но есть у студентов-иностранцев и их специфические проблемы. Оосбенно докучливая — правила передвижения внутри нашей страны. Даже для того, чтобы поехать отдыхать на Минское море, они должны получить визу. Поэтому остаётся порой только смотреть с завистью на советских ровесников, возвращающихся после встречи с природой.

Все эти трудности — часть работы землячеств. Вместе с задачами информационно-политическими. Для некоторых студентов связь с родиной осуществляется только благодаря радиопередачам оттуда, а также политинформациям и выпуску собственных газет. Иностранные студенты искренне итрересуются политикой: и внутренними проблемами нашей страны, и внешнеполитическими.

Благодаря землячествам для студентов проводятся также спортивные соревнования, культурные мероприятия, организуются экскурсии и походы, лагеря труда и отдыха, встречи с интересными людьми, посещения концертов и театральных спектаклей, различные конкурсы и вечера. В общем все то, без чего золотые студенческие годы потеряли бы свою красоту и неповторимость.

**Н. БОЛОТИНА,**
**Л. ЕРЕНЬКОВ,**
**М. РОМАНЕНКО,**
**преподаватели кафедры методики преподавания русского языка по обучению иностранных учащихся основных факультетов.**

# ПРОФЕССИОНАЛИЗМ ЛЮБИТЕЛЕЙ

*Чем отличается иностранный студент от советского? Подскажу: тем, что его не надо заставлять участвовать в спортивных соревнованиях. Он сам с удовольствием торопится на волейбольную или футбольную площадку, а к столу для игры в настольный теннис иногда вообще очередь выстраивается. Вот так спортсмены-любители и набивают руку, совершенствуют свое мастерство.*

*Спартакиада иностранных учащихся г. Минска, организатором которой является Городской комитет по физической культуре и спорту, еще раз убедила нас в том, что настоящий профессионализм может быть не только у мастеров.*

*Студенты-иностранцы высших учебных заведений города соревновались по шести видам спорта: баскетболу, кроссу, настольному теннису, волейболу, футболу и легкой атлетике. Нужно отметить, что прекрасную спортивную подготовку, высокое мастерство показали все без исключения команды, участвовавшие в соревнованиях. Итоговая таблица была очень плотной. Сборная иностранных учащихся нашего университета, занявшая по итогам всех видов второе место, буквально «наступала на пяты» команде-победителю. Так что в следующем году борьба ожидается напряженная, и отстаивать титул победителя будет нелегко.*

*А. ЕФИМОВ,*
*старший преподаватель кафедры физического воспитания и спорта.*





* Студент из Мадагаскара Ромеро поёт о русском солдате Алеше. Эта песня трогает сердца слушателей, помогает понять, насколько символичен образ воина-спасителя, воина-освободителя;
* ангольский народный танец.

## ВСТРЕЧИ

# ЗНАКОМЬТЕСЬ: ХУАН КАРЛОС

**Я представляла это знакомство иным. Вы берете в руки свежий номер многотиражки, и ваше внимание привлекает снимок. Приятная улыбка, чуть прищуренные глаза — задумчивые и немножко с хитринкой. Возможно, кто-то узнает в нем коллегу по работе, другой знаком с этим молодым человеком по общественным делам, третий просто обратил внимание на своего соседа в библиотеке...**

**Но, к сожалению, снимок не состоялся.**

**ХУАН КАРЛОС (Эквадор) — аспирант кафедры ядерной физики физического факультета БГУ — фотографироваться вежливо отказался. Что ж, придется знакомиться заочно. Но сразу предупреждаю: Карлос не любит говорить о политике (считает, что люди устали от таких бесед) и о работе.**

**— Карлос, при решении вопроса о поездке на учебу за границу у Вас был выбор: Бразилия, Мексика, США и СССР. Что же все-таки перетянуло чашу весов в пользу Советского Союза?**

— Если честно, в какой-то степени сыграло роль то, что здесь иностранные студенты могут получать стипендию и надеяться на обеспечение местом в общежитии. Меня, тогда девятнадцатилетнего молодого человека, признаться, немного страшило, что в чужой, совершенно незнакомой стране (если бы выбор пал на США или Мексику) нужно будет искать работу и жилье. Но все же главным является огромный интерес к вашей стране. В то время вы были словно луч счета в темном царстве. Мне непременно хотелось посмотреть родину Пушкина, Тургенева, Достоевского.

**— А посмотрев, не разочаровались?**

— Нет. За десять лет эта страна, Минск стали мне близки и дороги. Здесь прошли мои самые прекрасные молодые годы, здесь я встретил любовь, создал семью. Я — маленькая частичка в море человеческих судеб. Меня так же, как и вас, волнуют и затрагивают все проблемы и трудности, которые, будто паутина, опутали ваше общество. Хотя бы потому, что здесь живет моя семья.

**— Как Вы думаете, сможем ли мы преодолеть сегодняшнее кризисное состояние в экономике?**

— Я в этом твердо убежден. Иначе просто нельзя. Вы обязаны это сделать. Но падение будет продолжаться, потому что такова психология человека: чтобы подняться, ему нужно окончательно упасть. Вы не первая страна, которая столкнулась с трудностями, но у вас достаточно сил, чтобы преодолеть их.

Пожалуйста, давайте не будем больше говорить о политике.

**Тогда расскажите о своей семье.**

— Пять месяцев назад нас было трое: я, жена Елена — сотрудница мехмата и дочь Софья. Потом в нашем полку прибыло — родился сынуля. Назвали его Хуан Антонио.

**— И на кого похожи дети?**

— У дочери удивительно сочетаются серые глаза и темные волосы. Представляю, как будет рад мой отец, когда увидит внука — свое кареглазое и черноволосое отражение.

**— Это случится скоро?**

— Думаю, ждать осталось недолго. Примерно через полгода я буду дышать родным воздухом, ходить по знакомым с детства тропинкам и вновь открывать для себя свою страну — пожалуй, через десять лет разлуки с ней я тоже буду там как иностранец. Но, уверен, это продлится недолго. Да и рядом со мной будут жена, дети — этого достаточно, чтобы я чувствовал себя хорошо. А потом — работа, друзья, общение.

**— Карлос, не боитесь ли Вы, что увезя жену с собой, лишите ее родины? А что дадите взамен?**

— У вас удивительно прочно вселились в сознание людей предрассудки. Почему принято считать, что если человек уехал жить в другую страну, то он предал свою родину? Я тоже десять лет нахожусь далеко от дома. Но постоянно думаю о нем, переживаю за свой народ. Там моя семья, моя культура, мои соотечественники — там мои корни. Почему человек не может просто любить родину, а это должно обязательно как-то выражаться? Кому нужен этот фальшивый патриотизм? Я хочу, чтобы моя жена и дети также полюбили Эквадор, как я Белоруссию. Моя обязанность — помочь им.

**— А на каком языке будут говорить Ваши дети?**

— Пока дочь задает свои сложные вопросы на русском. Я упустил тот момент, когда надо было начинать учить ребенка разговаривать на русском и испанском языках. Но с сыном такое не повторится. И вообще я считаю, что дети, даже если будут жить у меня на родине, не должны забывать свой родной русский язык.

**— Карлос, Вы счастливы?**

— Да. Несмотря на то, что пришлось пережить много трудностей и неприятностей. Но жизнь заставила сделать вывод, что нет безвыходных ситуаций, решение проблемы обязательно найдется. Теперь, оглядываясь назад, я с радостью отмечаю, что почти все в жизни делал правильно.

**Беседовала**
**З. АЛЕШКЕВИЧ.**

## МНЕНИЕ

# Кто возьмёт инициативу?

На историческом факультете занимаются представители 13 стран мира. И в первые же дни после избрания председателем профбюро факультета мне пришлось столкнуться с массой проблем, касающихся жизни и быта иностранных студентов.

Одна из них — взаимоотношения между иностранными и советскими студентами. Сегодня этот вопрос не снят с повестки дня, но тем не менее сдвиги есть. Одно из достижений — отошла в прошлое практика «интернационализации» студенчества, что выражалось в обязательном заселении в комнату советских и иностранных студентов. Это не помешало подлинной дружбе. Пример — проходивший в апреле турнир общежития по мини-футболу, участие в котором приняли действительно интернациональные команды.

И еще один вопрос — быт иностранных студентов. Общежитие мы называем «вторым домом». Для иностранцев оно должно стать таким потому, что на протяжении пяти лет для многих из них это единственное пристанище. Что же получается на самом деле?

Землячествам в нашем общежитии просто негде собраться, поговорить, обсудить свои проблемы. Уже более года комнаты отдыха и «Дружбы» находятся на ремонте, который ведется от случая к случаю. В антисанитарном состоянии и места общего пользования. Больше месяца в общежитии нет горячей воды. Я призываю хозяйственные службы университета и города проявить инициативу и повернуться лицом к проблемам быта иностранных учащихся.

**В. БУРДО,**
**председатель профбюро исторического факультета.**

## ПРИГЛАСИТЕЛЬНЫЙ БИЛЕТ



*Традиционное место летнего отдыха иностранных студентов — дом отдыха «Нарочь». В этом году тут будет работать две смены. Интернациональный лагерь «Дружба» ждет своих гостей.*

# МЕРИДИАН

СПЕЦВЫПУСК ОБ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТАХ

# МАЙСТРОЎНЯ

## КАВАЛАЧКІ ЖЫЦЦЯ



Мамдух Хамадах — сірыец, студэнт V курса факультэта журналістыкі.

Мамдух Хамадах — мастак, за плячыма якога пяць выставак.

Сур'ёзна пачаў займацца маляваннем тры-чатыры гады назад. А да гэтага «для сябе, для душы». Любіў накідваць пейзажы алоўкам.

Цяпер захапляецца графікай і карыкатурай. Чым прыцягвае? Супляценнем чорнага і белага.

— Любімых колераў, — падкрэслівае Мамдух.

У стосе можна знайсці малюнкі на самыя разнастайныя тэмы: каханне, жыццёвыя дробязі, ёсць так званы «чорны гумар». Пераважае ўсё ж палітычная карыкатура.

НАПАМІНАК НА БУДУЧАЕ: Мамдух Хамадах рыхтуе выстаўку графікі, якая ў хуткім часе з'явіцца ў сценах яго роднага факультэта, які знаходзіцца на вуліцы Маскоўскай, 15...




## САМАРЭКЛАМА

*Кожны чалавек спрабуе больш поўна раскрыць і выкарыстаць свае магчымасці, аднак маладым талентам, якія займаюцца літаратурнай творчасцю, цяжка ў адзіночку прабіваць сабе дарогу «на Парнас». Разам заўсёды лягчэй — менавіта таму і ўтварылася наша літаб'яднанне. Існуе яно зусім няшмат і таму гаварыць пра нейкія вынікі, напэўна, рана. Першымі публікацыямі мы проста хочам пазнаёміць з некаторымі членамі літаратурнага аб'яднання «Мысль и слово». І яшчэ. Нашы дзверы адчынены, а сустрэчы адбываюцца ў чацвер а 19-й гадзіне. Заходзьце да нас на адрас: вул. Кастрычніцкая, 2 (прыпынак трамваяў 1, 4, 7 «Стадыён «Дынама»), пакой 702.*

## НАДЕЖДА АНТИПОВА

— Біяграфія? Яе ў мяне няма — нічога не паспела зрабіць яшчэ. Такая, як усе: з дзівацтвамі і заскокамі. Валакуся па беламу свету і вучуся здзіўляцца жыццю.

* * *

Разве можно просить тепла у
холода?
От айсбергов глаз замерзаю.
Разве можно просить глотка
у голода?
Без губ-родников засыхаю.
Разве можно просить пенья
птиц у осени?
Без сонетов-слов я немею.
Разве можно просить юных лет
у проседи?
Без твоей любви я старею.

* * *

Звезды плачут весной
нежно-оснежные
слезы роняя
и из них вырастают
ландыши
на ладони
горстка звезд
далеких и близких
что есть сил
вдохну
аромат тайны
а из глаз-лепестков
бубенцы зазвенят
соленые
в ковш Медведицы
на щеке моей
звездами вышитый
и возможное
и невозможное
отразятся
друг в друге.

* * *

Душа лежит в реанимации,
А тело ждет Марию Магдалину.
Толпы хлыстоголосые овации
Душе целуют грудь и спину.
Губами-розгами впиваются ей
в губы
Хохочут грубо и кусают.
Но понапрасну силы губят —
Душа никак не оживает.
Без дома. И без доли —
прокаженная.
Чужим своя, своим чужая.
В беззвучной раковине,
холодом прожженная.
Уже без боли. И еще, увы, живая.

## ОЛЕГ ЗАЙЦЕВ

Нарадзіўся ў горадзе Наваполацку, адкуль праз восем гадоў разам з бацькамі пераехаў у Полацк. У 1986 годзе быў прызваны на тэрміновую службу. Пасля арміі вярнуўся дадому і ў тым жа годзе паступіў вучыцца на дзённае аддзяленне факультэта журналістыкі, дзе працягвае вучобу і сёння.

### РАЗМЫШЛЕНИЕ

Когда бы мог увидеть я
Все грани своего паденья,
Итогом мрачного виденья,
Быть может, стала б жизнь моя.
Зачем существовать на свете,
Всех презирая и презренный
всеми,
Построив жизнь по нелепой
схеме,
И все воспринимая в черном
свете.
Все бытие людское так туманно,
Что даже ценности
переосмыслить можно,
Но жизнь прожить легко и
осторожно,
Не сделав ничего, довольно
странно.
И после врать себе, пожалуй,
тоже сложно,
И трудно сделать горькое
признанье:
Такая жизнь, не жизнь —
существованье,
И все, что происходит,—
ложно.

## ДЗВЕ МАЦІ (легенда)

Ірына МАСЛЕНІЦЫНА

Кажуць, назва Радзеж узяла пачатак ад двух слоў: «радзець» і «радавацца», бо жылі ў гэтым паселішчы вясёлыя, працавітыя людзі. Вырошчвалі яны хлеб, палявалі ды бортнічалі і вельмі любілі зямлю сваю. Загадаў князь пабудаваць у Радзежы вартавую драўляную вежу і размясціць у ёй атрад ратнікаў, каб было каму ахоўваць радзежаўцаў, ды ў выпадку нашэсця варожага падаць сігнал агнём княжацкаму войску. Ды толькі воінам усё больш даводзілася сялянскімі справамі займацца: ніхто не пагражаў пакою гасціннага паселішча.

Бяда заўсёды прыходзіць нечакана. Чорнае сонца ўзышло над Радзежам у той дзень. Наляцелі лютыя ворагі-татары. Нядоўга біліся воі-абаронцы: усе смерць прынялі ад татарскіх клінкоў ды стрэлаў, напаілі крывёй свайёй радзежскую зямлю...

Узялі чужынцы Радзеж. Тады шмат каму кінулася ў вочы жанчына-татарка са зморшчаным, абветраным тварам і ганарлівым поглядам. Сядзела яна на вялікім белым вярблюдзе. Пачціва схіляючыся, рухаліся за ёй восем дужых мужчын. Пранеслася вестка, што наведала Радзеж сама Хатунь — усемагутная маці мурзы Туліба. Казалі, што калісьці прывяла яна да шатра хана Батыя дзевяць сыноў сваіх са словамі:

— Далёка ў гарах жытло маё, мала хто ведае шлях туды і магла б схаваць дзяцей маіх ад цябе, зберагчы іх ад крывавых бітваў. Але неразумнаю была б я, калі б зрабіла так. Прымі ж у дар ад маці самае дарагое, што яна мае.

Яшчэ не паспела сонца схавацца за ракою, — пачаліся ў Радзежы пагромы. Татары ўрываліся ў хаты, забівалі мужчын і дзяцей, гвалцілі жанчын, распіхвалі па скураных сумках каштоўнасці. Стогны і плач луналі над Радзежам. І толькі старая Хатунь спакойна глядзела на гора людское.

Здарылася тое, чаго ніколі яшчэ не здаралася: сыны Хатуні пасварыліся — не падзялілі здабычу. Маці паспела своечасова, як раз у той момант, калі ўжо ўзмятнуліся ў паветра шаблі. Адзіны ўладны ўзмах рукі — і спыніліся раз'юшаныя браты, апусцілі зброю. У цяжкім маўчанні вочы Хатуні знайшлі прычыну сваркі: прыгожая маладзенькая дзяўчына са спалоханымі вялікімі вачыма. І, угледаючыся ў пяшчотны твар яе, лёгкую постаць, доўгія хвалістыя валасы, зразумела Хатунь: з-за гэтай незвычайнай красы пераб'юць яе сыны адзін аднаго. І сказала тады яна:

— Сорамна мне за дзяцей маіх, бо звар'яцелі яны, убачыўшы прыгожы твар ды доўгія косы. Што ж, калі вы ўсе страцілі галовы, я вырашу вашу спрэчку, і вы зробіце так, як загадаю вам я, маці ваша Хатунь,— сыны пакорліва схілілі галовы. Тады працягвала старая ўжо больш спакойна.— Магла б я загадаць вам забіць яе, каб не вылучаць нікога з вас, ды баюся, што будзеце ўсе насіць у сэрцах сваіх крыўду на мяне. Магла б падараваць яе Тулібу, бо старэйшы ён з вас, і па законах нашых яму належыць спрэчная здабыча. Але не хачу, каб іншыя пачалі помсціць брату з-за зайздрасці. Таму аддаю прыгожую паланянку ўсім вам. І няхай валодае ёю ў гэтую ноч кожны з сыноў маіх па чарзе, ад старэйшага да малодшага. І так ды будзе ўсялякі раз, калі здабыча аднаго з вас спадабаецца іншым.

Ажывіліся, загаманілі браты. З усмешкай падышоў да красуні мірза Туліб, і ў гэты момант прасвістала і ўпілася ў пляцо старэйшага сына Хатуні страла. Калі б не пасунуўся военачальнік татарскі ўбок, то пранізала б яна яго сэрца, бо цвёрдай, відаць, была рука ды трапным вока таго, хто пусціў яе.

Ускрыкнула Хатунь, нібы ўстрывожаная начная птушка, кінуліся татары на пошукі смельчака, ды хутка і прывялі яго. З нянавісцю глядзеў на ворагаў сваіх пятнаццацігадовы радзежанец.

— Смерць яму,— курчачыся ад болю, крыкнуў татарскі военачальнік.

— Не! — раздаўся раптам чыйсьці голас. Расштурхваючы воінаў-чужынцаў, да белага вярблюда Хатуні наблізілася жанчына і, як падсечаная, упала на калені.

— Хатунь! Мудрая Хатунь! Гэта сын мой, а ўступіўся ён за гонар сястры. Хіба ж твае сыны інакш на яго месцы зрабілі б? Ты маці, Хатунь, няўжо ж не зразумееш мяне? Дзеці ж мае — адзінае, што маю на зямлі гэтай, бо ўдавіца я горкая. Не будзе іх — навошта і жыць? Даруй, калі ў чым вінаватыя перад табой, і захавай ім жыццё.

Моўчкі з бясстрасным тварам слухала Хатунь радзежанскую маці. І калі тая скончыла, вусны татаркі скрывіла пагардлівая ўсмешка:

— Ты ўсё сказала, жанчына? Цяпер слухай мяне. Няма ў жыцці іншай праўды, чым праўда моцы. І гэтаму я як маці вучыла сваіх сыноў. Яны прынялі да сэрца гэтую навуку. Па праву моцнага прыйшлі мы сюды. Па гэтаму ж праву дасталася сынам маім твая дачка і трэба карыцца іх волі. Непакорным жа мы спрадвеку хрыбты ламаем. Сына твайго заб'юць, каб іншыя зразумелі: так будзе з кожным, хто пойдзе супраць сыноў Хатуні.

— Дык забі ж тады і мяне, жорсткая жанчына,— ускрыкнула радзежанка.

— Мы справядлівыя ў пакаранні сваім,— ганарліва вымавіла Хатунь.— Ты ні ў чым не вінаватая перад намі.

Так загінуў юны сын Еўпраксіі-ўдавіцы. Не на шмат перажыла яго і прыгажуня-сястра — яшчэ да раніцы памерла яна ў грубых адбымках сыноў Хатуні.

Уначы ўспыхнула вежа вартавая. Ускінулася Хатунь, у шацёр мірзы Туліба паспяшалася.

— Ты загадаў спаліць?

— Я. Той, хто страляў у мяне, адтуль цэліўся. Не хачу, каб прыстанішчам для іншых ворагаў стала гэтая вежа.

— Загадай загасіць полымя! Хутчэй! — усхвалявана ўскрыкнула Хатунь.— Дрэнныя адчуванні на сэрцы ў мяне, а я яшчэ ніколі не памылялася...

Але ўжо паспелі заўважыць полымя княжыя дружыннікі, і званы ўжо склікалі апалчэнцаў-гараджан на дапамогу Радзежу.

Бітва адбылася на світанку. У ранішнім тумане паляцелі на няпрошаных гасцей слаўныя воі. І загінулі ў бойцы той усе сыны Хатуні.

І пагнаў жах прэч татараў. Моўчкі праводзіла іх татарка пустым, нежывым поглядам. Потым узяла яна нож і перарэзала ім горла свайму беламу вярблюду. Целы ж сыноў сваіх знайшла, паклала побач ... і лягла ў іх нагах.

Са слязьмі на вачах глядзеў князь на тое, што рабілася з яго Радзежам. Калі ж наблізіўся да яго невялічкі гурт уцалелых радзежан і выйшла няшчасная Еўпраксія, знямелая, сівая, з патухшымі вачыма, у суме схіліў князь галаву сваю:

— Прабачце мяне, радзежане. Не змог я раней прыйсці, абараніць вас...

І тады Еўпраксія ціха сказала:

— Княжа, за сялом, на полі, дзе білі вы паганых,— забойца дзяцей маіх. Адпомсці за мяне.

Убачыўшы людзей, што набліжаліся да яе, узнялася, выйшла перад імі Хатунь.

— Гэта жанчына? — здзівіўся князь.— Хіба павінны я помсту сваю на жанчыну накіроўваць?

— Гэта — Хатунь! Жорсткая забойца! Маці нелюдзя Туліба! Кат Радзежа! — закрычалі з усіх бакоў радзежане.— Смерць ёй, смерць! Няхай загіне, як загінулі і сыны яе!

— Але я не магу дазволіць забіць жанчыну,— адказаў князь.

Натоўп загаманіў, тады Хатунь моўчкі зрабіла некалькі нерашучых крокаў наперад, і Еўпраксія раптам зразумела: яна жадае смерці. Зразумела, бо сама не так даўно маліла аб гэтым чужынцаў. І тады яна закрычала:

— Княжа! Нельга нам у жорсткасці сваёй быць падобнымі на паганых. Ты хочаш пакінуць ёй жыццё. Але хіба для маці, якая страціла ўсіх дзяцей сваіх, не будзе гэта ў тысячу разоў больш жахлівым за смерць? Днём маліць будзе яна аб тым, каб хутчэй надышла ноч і прынесла забыццё, а ноччу — каб узышло сонца і разагнала жахлівыя сны, у якіх кожны раз будзе бачыць адно і тое ж: смерць дзяцей сваіх. Так магла зрабіць і так зрабіла яна, Хатунь, са мною.

Хатунь памерла лёгка — па знаку князя адзін з ратнікаў спыніў яе сэрца кінжалам. Яе пахавалі ў адной магіле з сынамі. З тых часоў поле гэтае ды і ўсе землі ўрочышча сталі называцца «Збыта-Пазбаўлена», бо са смерцю Хатуні скончыліся набегі татар у гэтыя мясціны.

Жыхары вёскі Радзеж, што пад Маларытай, здаецца, і да гэтых часоў шчыра вераць, што ўсё зло, уся жорсткасць чалавечая пахаваны ў магіле Хатуні, за іх сялом. Таму паранейшаму ўпэўнена і светла гучаць іх спевы ў час працы.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПІ імя Я. Коласа.

7 чэрвеня
Зак. 2017.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.